DISCLAIMER: As Member States provide national legislations, hyperlinks and explanatory notes (if any), UNESCO does not guarantee their accuracy, nor their up-dating on this web site, and is not liable for any incorrect information. COPYRIGHT: All rights reserved.This information may be used only for research, educational, legal and non-commercial purposes, with acknowledgement of UNESCO Cultural Heritage Laws Database as the source (© UNESCO).

Зарегистрировано в Национальном реестре правовых актов
Республики Беларусь 24 мая 2002 г. N 5/10482

**ПАСТАНОВА САВЕТА МІНІСТРАЎ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ**
**22 мая 2002 г. N 651**

**АБ ЗАЦВЯРДЖЭННІ ПАЛАЖЭННЯ АБ АХОВЕ АРХЕАЛАГІЧНЫХ АБ'ЕКТАЎ ПРЫ ПРАВЯДЗЕННІ ЗЕМЛЯНЫХ І БУДАЎНІЧЫХ РАБОТ**

(в ред. постановления Совмина от 15.06.2006 N 762)

У мэтах далейшага ўдасканалення дзяржаўнага ўліку, аховы, выкарыстання і прапаганды археалагічнай спадчыны Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь ПАСТАНАЎЛЯЕ:

1. Зацвердзіць Палажэнне аб ахове археалагічных аб'ектаў пры правядзенні земляных і будаўнічых работ (прыкладаецца).

2. Кантроль за выкананнем патрабаванняў Палажэння аб ахове археалагічных аб'ектаў пры правядзенні земляных і будаўнічых работ ускласці на Міністэрства культуры.

3. Рэспубліканскім органам дзяржаўнага кіравання ў двухмесячны тэрмін прыняць меры па прывядзенню сваіх нарматыўных прававых актаў у адпаведнасць з дадзенай пастановай.

Прэм'ер-міністр Рэспублікі Беларусь Г.НАВІЦКІ

UNESCO Cultural Heritage Laws Database (Copyright and Disclaimer apply)

DISCLAIMER: As Member States provide national legislations, hyperlinks and explanatory notes (if any), UNESCO does not guarantee their accuracy, nor their up-dating on this web site, and is not liable for any incorrect information. COPYRIGHT: All rights reserved.This information may be used only for research, educational, legal and non-commercial purposes, with acknowledgement of UNESCO Cultural Heritage Laws Database as the source (© UNESCO).

ЗАЦВЕРДЖАНА
Пастанова
Савета Міністраў
Рэспублікі Беларусь
22.05.2002 N 651

# ПАЛАЖЭННЕ
# АБ АХОВЕ АРХЕАЛАГІЧНЫХ АБ'ЕКТАЎ ПРЫ ПРАВЯДЗЕННІ ЗЕМЛЯНЫХ І БУДАЎНІЧЫХ РАБОТ

(в ред. постановления Совмина от 15.06.2006 N 762)

## Агульныя палажэнні

1. Дадзенае Палажэнне вызначае склад і парадак ажыццяўлення дзяржаўнымі органамі, юрыдычнымі і фізічнымі асобамі абавязковых мер па ахове археалагічных аб'ектаў пры правядзенні земляных і будаўнічых работ з мэтай выкарыстання археалагічных аб'ектаў у інтарэсах гуманітарнай адукацыі, навукі і культуры, а таксама развіцця чалавечай асобы.

Асобы, вінаватыя ў невыкананні правілаў па ахове археалагічных аб'ектаў, нясуць адказнасць у адпаведнасці з заканадаўствам Рэспублікі Беларусь.

2. У дадзеным Палажэнні прымяняюцца наступныя асноўныя тэрміны:

археалагічныя аб'екты - матэрыяльныя аб'екты ці іх комплексы, якія ўзніклі ў выніку жыццядзейнасці чалавека ад яго з'яўлення да перыяду новай гісторыі і выяўлены на аснове спецыяльных археалагічных метадаў. Да матэрыяльных аб'ектаў для мэт прызнання археалагічным аб'ектам адносяцца ў прыватнасці ўмацаваныя старажытныя паселішчы (гарадзішчы, гарады, замкі) і неўмацаваныя старажытныя паселішчы (стаянкі, селішчы), могільнікі (курганныя і грунтавыя), асобныя пахаванні, рэшткі старажытных умацаванняў і вытворчых комплексаў (шахты, майстэрні, металургічныя печы), транспартныя шляхі, культавыя аб'екты (свяцілішчы, святыя месцы, каменныя крыжы і камяні з выявамі і надпісамі), рэчавыя і манетныя скарбы, асобныя старажытныя рэчы, культурны пласт гістарычных частак населеных пунктаў і сакральных аб'ектаў;

земляныя і будаўнічыя работы - будаўнічы працэс, які ўключае распрацоўку (выемку) грунту, яго перамяшчэнне і ўкладку на пэўным месцы. Да земляных і будаўнічых работ адносяцца ў прыватнасці пракладка нафта- і газаправодаў, камунікацый, будаўніцтва будынкаў, гідратэхнічных і іншых збудаванняў, дарог, распрацоўка кар'ераў;

тэрыторыя археалагічнага аб'екта - зямельны ўчастак, заняты археалагічным аб'ектам і звязаны з ім гістарычна і функцыянальна;

зона аховы археалагічнага аб'екта - тэрыторыя, якая непасрэдна акружае археалагічны аб'ект, прызначаная для аховы археалагічнага аб'екта і бліжэйшага да яго асяроддзя, а таксама мэтазгоднага выкарыстання археалагічнага аб'екта і спрыяльнага яго ўспрыняцця;

ахова археалагічных аб'ектаў - сістэма арганізацыйных, прававых і эканамічных мер па зберажэнню археалагічных аб'ектаў;

дазвол дзяржаўнай навуковай установы "Інстытут гісторыі Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі" - дакумент, які выдаецца дзяржаўнай навуковай установай "Інстытут гісторыі Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі" ва ўстаноўленым парадку і з'яўляецца пацвярджэннем прадастаўленага Нацыянальнай акадэміяй навук Беларусі выканаўцам права на правядзенне археалагічных даследаванняў.
(абзац введен постановлением Совмина от 15.06.2006 N 762)

3. Дзейнасць у адносінах да археалагічных аб'ектаў, якія з'яўляюцца матэрыяльнымі гісторыка-культурнымі каштоўнасцямі, рэгулюецца Законам Рэспублікі Беларусь ад 9 студзеня 2006 года "Аб ахове гісторыка-культурнай спадчыны Рэспублікі Беларусь" (Национальный реестр правовых актов Республики Беларусь, 2006 г., N 9, 2/1195) і дадзеным Палажэннем.
(в ред. постановления Совмина от 15.06.2006 N 762)

Характар дзейнасці ў дачыненні да археалагічных аб'ектаў, якія не з'яўляюцца матэрыяльнымі гісторыка-культурнымі каштоўнасцямі, вызначаецца Міністэрствам культуры на падставе заключэння дзяржаўнай навуковай установы "Інстытут гісторыі Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі". Правядзенне земляных і будаўнічых работ на тэрыторыі археалагічнага аб'екта ажыццяўляецца па ўзгадненню з Міністэрствам культуры.
(часть вторая п. 3 в ред. постановления Совмина от 15.06.2006 N 762)

DISCLAIMER: As Member States provide national legislations, hyperlinks and explanatory notes (if any), UNESCO does not guarantee their accuracy, nor their up-dating on this web site, and is not liable for any incorrect information. COPYRIGHT: All rights reserved.This information may be used only for research, educational, legal and non-commercial purposes, with acknowledgement of UNESCO Cultural Heritage Laws Database as the source (© UNESCO).

4. Рэжым утрымання зацверджаных у праектах зон аховы археалагічных аб'ектаў абавязковы для выканання ўсімі юрыдычнымі і фізічнымі асобамі.

Распрацоўка мер па ахове археалагічных аб'ектаў у зонах
земляных і будаўнічых работ

5. Звесткі аб археалагічных аб'ектах, зонах аховы археалагічных аб'ектаў уключаюцца ў склад генеральных планаў развіцця гарадоў і іншых паселішчаў, праектаў дэтальнай планіроўкі і другіх горадабудаўнічых праектаў, праектаў гаспадарчага развіцця тэрыторый і іншай праектнай дакументацыі з мэтай аховы археалагічных аб'ектаў пры рэалізацыі ўказаных планаў і праектаў. Названыя планы і праекты падлягаюць узгадненню з Міністэрствам культуры.
(в ред. постановления Совмина от 15.06.2006 N 762)

6. Усе віды земляных і будаўнічых работ у зоне аховы археалагічных аб'ектаў могуць праводзіцца толькі пасля распрацоўкі і ажыццяўлення мер па іх ахове. Меры па ахове археалагічных аб'ектаў павінны прадугледжвацца на ўсіх этапах перадпраектных, праектных работ і пры ўсіх відах будаўніцтва аб'ектаў і пабудоў. Распрацоўка сістэмы мер па ахове археалагічных аб'ектаў уключаецца ў праектна-каштарысную дакументацыю на правядзенне ўсіх відаў земляных і будаўнічых работ і ўзгадняецца з Міністэрствам культуры.
(в ред. постановления Совмина от 15.06.2006 N 762)

7. Меры па ахове археалагічных аб'ектаў павінны прадугледжваць наступныя віды работ:

фіксацыя ўжо вядомых археалагічных аб'ектаў на праектным матэрыяле;

абследаванне зоны земляных і будаўнічых работ з мэтай выяўлення няўлічаных археалагічных аб'ектаў, іх фіксацыя і пры неабходнасці навуковае даследаванне.

Меры па ахове археалагічных аб'ектаў у зоне земляных і будаўнічых работ распрацоўваюцца арганізацыямі, якім выдадзены дазвол дзяржаўнай навуковай установы "Інстытут гісторыі Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі" ў адпаведнасці з дагаворамі, заключанымі дзяржаўнай навуковай установай "Інстытут гісторыі Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі" з юрыдычнымі, фізічнымі асобамі, якія вядуць праектаванне ў названых зонах.
(часть вторая п. 7 в ред. постановления Совмина от 15.06.2006 N 762)

8. Фінансаванне мер па ахове археалагічных аб'ектаў у зонах земляных і будаўнічых работ праводзіцца юрыдычнымі і фізічнымі асобамі, якія з'яўляюцца заказчыкамі праектных і будаўнічых работ.
(в ред. постановления Совмина от 15.06.2006 N 762)

Меры па ахове археалагічных аб'ектаў пры правядзенні
земляных і будаўнічых работ

9. Меры па ахове археалагічных аб'ектаў пры правядзенні ўсіх відаў земляных і будаўнічых работ ажыццяўляюцца ў адпаведнасці з заканадаўствам Рэспублікі Беларусь і прадугледжваюць:

забарону ўсіх відаў работ на тэрыторыі плануемага будаўніцтва;

замену тэрыторыі будаўніцтва;

стварэнне інжынернай абароны археалагічных аб'ектаў;

навуковае даследаванне археалагічных аб'ектаў;

нагляд археолагаў за выкананнем ахоўных мер пры правядзенні земляных, будаўнічых і іншых работ;

кансервацыю археалагічных аб'ектаў у складзе будаўнічага комплексу;

іншыя меры, прадугледжаныя заканадаўствам Рэспублікі Беларусь.

10. Міністэрства культуры, а таксама археолагі, кваліфікацыя якіх пацверджана пасведчаннем на права выканання навукова-даследчых работ на гісторыка-культурных каштоўнасцях і кіраўніцтва распрацоўкай навукова-праектнай дакументацыі на выкананне рэстаўрацыйна-аднаўленчых работ на гісторыка-культурных каштоўнасцях, маюць права сваім рашэннем прыпыніць земляныя і будаўнічыя работы ў выпадку з'яўлення пагрозы пашкоджання ці знішчэння археалагічнага аб'екта.
(п. 10 в ред. постановления Совмина от 15.06.2006 N 762)

11. Юрыдычныя і фізічныя асобы ў выпадку выяўлення археалагічных аб'ектаў пры правядзенні земляных і будаўнічых работ павінны паведаміць аб гэтым Міністэрству культуры і прыпыніць далейшае вядзенне работ.

На падставе звароту Міністэрства культуры дзяржаўная навуковая ўстанова "Інстытут гісторыі Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі" дае заключэнне аб навуковай вартасці выяўленага аб'екта і прапануе меры па яго ахове.

DISCLAIMER: As Member States provide national legislations, hyperlinks and explanatory notes (if any), UNESCO does not guarantee their accuracy, nor their up-dating on this web site, and is not liable for any incorrect information. COPYRIGHT: All rights reserved.This information may be used only for research, educational, legal and non-commercial purposes, with acknowledgement of UNESCO Cultural Heritage Laws Database as the source (© UNESCO).

(п. 11 в ред. постановления Совмина от 15.06.2006 N 762)

12. Размяшчэнне археалагічных аб'ектаў фіксуецца ў кожным раёне краіны на раённых картах землекарыстання.

Інфармацыя аб размяшчэнні археалагічных аб'ектаў, якая атрымана ў ходзе правядзення земляных і будаўнічых работ, прадстаўляецца навуковымі арганізацыямі археалагічнага профілю, выканаўцам якіх прадастаўлена права на правядзенне археалагічных даследаванняў. Дадзеная інфармацыя ўключае ў сябе ілюстраваныя і тэкставыя матэрыялы, якія распрацоўваюцца на аснове сучасных картаграфічных матэрыялаў, узгадняюцца дзяржаўнай навуковай установай "Інстытут гісторыі Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі" і Міністэрствам культуры, пасля чаго зацвярджаюцца дзяржаўнымі органамі землекарыстання.

(часть вторая п. 12 в ред. постановления Совмина от 15.06.2006 N 762)

Палявыя археалагічныя даследаванні ў зонах правядзення
земляных і будаўнічых работ

13. Кіраўніцтва археалагічнымі разведкамі і раскопкамі ў зоне правядзення ўсіх відаў земляных і будаўнічых работ ажыццяўляецца спецыялістамі адпаведнай кваліфікацыі, якая пацверджана пасведчаннем на права выканання навукова-даследчых работ на гісторыка-культурных каштоўнасцях і кіраўніцтва распрацоўкай навукова-праектнай дакументацыі на выкананне рэстаўрацыйна-аднаўленчых работ на гісторыка-культурных каштоўнасцях.

(в ред. постановления Совмина от 15.06.2006 N 762)

14. Правядзенне археалагічных даследаванняў ажыццяўляецца на падставе дазволу Міністэрства культуры.

(в ред. постановления Совмина от 15.06.2006 N 762)

UNESCO Cultural Heritage Laws Database (Copyright and Disclaimer apply)